УДК 72.025

**Рэстаўрацыя капліцы ў в. Просці. Ваконныя і дзвярныя запаўненні**

Шэстак Ю. Т.
Беларускі нацыянальный тэхнічны ўніверсітэт

Капліца-пахавальня сям'і Пратасевічаў у в. Просці Нясвіжскага раёна была пабудавана каля 1850 г. ў эклектычным стылі са спалучэннем рысаў неаготыкі і класіцызму. Будынак зроблены з цэглы на бутавым падмурку і атынкаваны. Меў выразны галоўны фасад, які завяршаўся высокім шчытом, багата дэкараваным шматпрофільнымі карнізамі. Капліца дзейнічала як рыма-каталіцкі малітоўны храм да Другой сусветнай вайны, потым была зачыненая і прыйшла ў заняпад, цалкам страціла вежу. Увесну 2009 г. распачаліся працы па аднаўленню будынка з наступным выкарыстаннем згодна асноўнай функцыі.

Перад пачаткам рэстаўрацыйных працаў быў вырашаны шэраг спецыфічных праблемаў, звязаных са зладжаннем запаўненняў ваконных і дзвярных праёмаў як істотных складовых частак вобліку фасадаў і вежы. Арыгінальныя дакументы, якія маглі б прадэманстраваць першасны выгляд гэтыях сталярных вырабаў, не былі знойдзеныя ў архівах. У наяўнасці меліся толькі ўскосныя звесткі. Таму праектныя рашэнні былі прынятыя па так званым метадзе выкарыстання аналагаў.

Даволі вялікая колькасць генетычна блізкіх пабудоваў-аналагаў, характэрных для дадзенага рэгіёна, дазволіла выкарыстаць шматлікія натурныя ўзоры і звязаныя з імі гістарычныя фотадакументы і інвентары для таго, каб вызначыць традыцыйныя прыёмы архітэктурна-мастацкай арганізацыі ваконных і дзвярных праёмаў, якія былі характэрнымі для рыма-каталіцкіх храмаў Беларусі, а таксама спосабы канструктыўнай арганізацыі і запаўнення ваконных і дзвярных праёмаў XIX ст.

На аснове праведзеных вышукванняў былі распрацаваны наступныя прапановы: гістарычна даставерныя архітэктурна-мастацкія, аб'ёмна-прасторавыя і канструктыўныя вырашэнні па аднаўленню ваконных праёмаў у разбураных і рэстаўраваных фрагментах муроў, а таксама рэканструкцыі запаўненняў у дзвярных і ваконных праёмах. У прынятых рашэннях была вытрымана арыентацыя на агульны эклектычны накірунак будынка са спалучэннем рысаў класіцызму і неаготыкі. Таксама вырашаныя задачы стварэння збалансаванай гармоніі паміж цэлым фасадам і яго сталярнымі дэталямі, не перанасычанасці гістарычных стылізацый.